ББК 63.3 (2Б)
Г 516

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Рэцэнзенты:* загадчык кафедры гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт П.І. Брыгадзін; загадчык кафедры гісторыі Беларусі Беларускага лінгвістычнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.Я. Новікаў.

*Пад агульнай рэдакцыяй* прафесара В. М. Фаміна,
дацэнта У. В. Тугая

Дапаможнік уключае ў сябе артыкулы па найбольш актуальных праблемах гісторыі Беларусі. Яго асаблівасцю з'яўляецца навуковы падыход да асвятлення разглядаемых пытанняў, імкненне выйсці за межы панаваўшых догмаў.

Прызначаецца студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых педагагічных навучальных устаноў.

ISBN 985-60-87-56-2

© Калектыў аўтараў, 1994.
© *Арыгінал-макет:* А.А. Пакала, 1994.

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

**Вучэбны дапаможнік
для студэнтаў гістарычных факультэтаў**

*Мінск 1994*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Вучэбнае выданне*

# Гісторыя Беларусі

*Вучэбны дапаможнік*
*для студэнтаў гістарычных факультэтаў*

*Карэктар* А. В. Сідарэнка

Падпісана ў друк 13.12.94. Фармат 60x84 1/16. Папера друк № 2.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 7,5. Ум. фарб.-адб. 8,00. Ул.-выд. арк. 6,7
Тыраж 200 экз. Заказ 1053. Цана 4500 р.

Ратапрынт БДПУ. 220809. г. Мінск, вул. Савецкая, 18.

## ЗМЕСТ

ПРАДМОВА .......... 3

БАЛТЫ І СЛАВЯНЕ НА БЕЛАРУСІ (*С. А. Адамовіч, В. І. Шадыра*) .......... 4

ПРАБЛЕМА ЎТВАРЭННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. КАНЕЦ XIII — ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIV СТ. (*А. Ф. Рацька*) .......... 8

НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ НА БЕЛАРУСІ Ў XVIII — XIX СТ. (*С. А. Адамовіч*) .......... 16

УДЗЕЛ ТАТАРАЎ-МУСУЛЬМАН У ПАЎСТАННІ 1794 ГОДА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ (*І. Б. Канапацкі*) .......... 23

ХТО ПЕРАМОГ НА Р. БЯРЭЗІНЕ Ў ЛІСТАПАДЗЕ 1812 ГОДА? (*І. А. Груша*) .......... 29

НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ДВАРАНСКАГА ЗЕМЛЕЎЛАДАННЯ НА БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX -- ПАЧАТАК XX СТАГОДДЗЯ) (*А. П. Жытко*) .......... 36

АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЯ І ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ДЛЯ ЧЫГУНАК БЕЛАРУСІ Ў 1900-1913 ГГ. (*П. А. Тупік*) .......... 44

БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (*М. В. Цуба*) .......... 53

АСВЯТЛЕННЕ АБАРОНЫ БЕЛАРУСКІХ ТЭРЫТОРЫЙ АД ПОЛЬСКІХ ВОЙСК У 1919 Г. У ДРУКУ БЕЛАРУСІ І ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ (*У. У. Куніцкі*) .......... 62

ДА ПЫТАННЯ АБ УТВАРЭННІ І ДЗЕЙНАСЦІ МІНСКАГА КАМІТЭТА АБ'ЯДНАНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП (САКАВІК — ЛІПЕНЬ 1917 Г.) (*М. Я. Сяменчык*) .......... 67

ПАЛІТЫЧНЫЯ РЭПРЭСІІ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 20-Х — 30-Я ГАДЫ (*М. К. Сакалоў*) .......... 78

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ Ў ГАЛІНЕ НАРКАМАСВЕТЫ Ў 20-Я ГАДЫ (*У. В. Тугай, В. Ц. Ісаеў*) .......... 87

ПОЛЬСКІЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ САВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ (20-30-Я ГГ. XX СТ.) (*У. В. Тугай, В. М. Фамін*) .......... 92

ФАРМІРАВАННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯЎ АРМІІ КРАЁВАЙ АКРУГІ "НАВАГРУДАК" (*С. П. Варадзін*) .......... 96

ПРАФСАЮЗЫ БЕЛАРУСІ Ў СІСТЭМЕ САВЕЦКАГА ТАТАЛІТАРЫЗМУ Ў ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1945-1985) (*Ф. А. Шумскі*) .......... 107



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

скончылі 273 педагогі, 170 урачоў, 125 эканамістаў[1]. Гэтыя спецыялісты ў далейшым прымалі актыўны ўдзел у беларусізацыі навучальных устаноў. К 1927 г. значна змяніўся склад студэнцтва: беларусаў было 60,3%, яўрэяў — 28%, рускіх — 4,8%, палякаў — 1,2% і 5,7% — студэнтаў іншых нацыянальнасцей[2].

Такім чынам, у выніку актыўнай дзейнасці Наркама, інтэлігенцыі к канцу 20-х гадоў былі дасягнуты значныя поспехі ў беларусізацыі сістэмы народнай адукацыі. Гэта сведчыла аб тым, што нягледзячы на аб`ектыўныя цяжкасці — бедная вучэбна-матэрыяльная база, адсутнасць дастатковай колькасці высокакваліфікаваных нацыянальных педагагічных кадраў — і суб`ектыўныя перашкоды працэс беларусізацыі быў горача падтрыманы беларусамі і даў плённыя вынікі.

## ПОЛЬСКІЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ САВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ (20-30-Я ГГ. XX СТ.)

У.В. Тугай, В.М. Фамін

У гісторыі сусветнай польскай дыяспары польская нацыянальная меншасць у СССР займае асобнае месца. Яго генеалагічная лінія была найбольш даўняй у Еўропе. Духоўныя стэрэатыпы палякаў на далёкіх крэсах фарміраваліся пад уздзеяннем традыцый барацьбы за захаванне сваёй польскасці, якія існавалі шмат стагоддзяў. Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 года, а таксама падзей 1918 і 1919 гадоў на Беларусі большая частка з іх аднеслася да гэтага абыякава, з недаверам. Яна больш праяўляла сімпатыі і лаяльнасці ў адносінах да сваёй адроджанай радзімы — Польшчы. Гэтая група насельніцтва прадстаўляла сабой у асноўным этнічна карэнны аўтахтанічны элемент, хоць і не састаяла з выключна генетычна польскіх нацыянальных элементаў. Значная яе частка складалася з генетычна беларускіх нацыянальных груп, якія ў розныя перыяды перайшлі ў каталіцтва і паланізаваліся. Тут даўно панаваў стэрэатып вызначэння нацыянальнай прыналежнасці "каталік — паляк". У гэтым сэнсе рэлігійны крытэрый пераважаў над усім іншым: моўным, культурным, грамадскім ці эканамічным.

У канцы XIX — пач. XX ст. колькасць польскага насельніцтва Беларусі і Літвы складала 5,5 — 5,6%. У асноўным палякі пражывалі ў Трокскім, Віленскім і Свенцянскім паветах Віленскай губ., Бельскім, Беластоцкім і Гродзенскім паветах Гродзенскай губ., Ковенскім, Вількамірскім, Новааляксандраўскім, Панявежскім і Шавельскім паветах Ковенскай губ. і ў Мінскім павеце. Трэба адзначыць адносна вялікую колькасць польскага насельніцтва ў многіх буйных гарадах краю: у Вільні — 47,8 тыс. (30,9%), Коўне — 16,0 тыс. (22,5%), Беластоку — 11,3 тыс.

[1] Там жа, л. 262.

[2] Там жа, л. 266



(16,9%), Гродне — 6,8 тыс. (14,0%). У гарадах шасці заходніх губерняў польскае насельніцтва складала 12,7%, у сельскай мясцовасці — толькі 4,6%.[1]

Палітыку савецкай дзяржавы ў адносінах да польскай нацыянальнай меншасці можна ўмоўна падзяліць на два перыяды, якія дыяметральна адрозніваюцца адзін ад другога. Першы перыяд адзначаецца стварэннем" шырокай сеткі польскай нацыянальнай аўтаноміі. III сесія ЦВК БССР, якая адбылася ў жніўні 1923 г., пацвердзіла поўнае раўнапраўе моў — беларускай, рускай, яўрэйскай, польскай, дэкларыравала права насельніцтва звяртацца ва ўсе дзяржаўныя ўстановы на сваёй роднай мове і абавязацельства ўсіх дзяржаўных устаноў адказваць на той жа мове.[2]

Спасылаючыся на недахопы сродкаў, сесія звярнулася да беларускага, яўрэйскага, польскага насельніцтва з заклікам дапамогі савецкай уладзе ў будаўніцтве культурна-асветніцкіх устаноў на роднай мове.

Польскія сельскія саветы пачалі ствараць у другой палове 1924 г. К пачатку 1925 г. на Беларусі налічвалася 2 польскія саветы. У сярэднім па дзяржаве (СССР) на польскі сельскі савет прыпадала 1166 чалавек (яўрэйскі — 2132). Па Украіне гэтая лічба склала 1000 чалавек, пазней — 500 чалавек. На Беларусі ў такой жа пастанове за норму для арганізацыі нацыянальнага польскага савета колькасць жыхароў склала 1200 чалавек. Аднак на практыцы гэта не было рэалізавана. У 1929 г. сярод 51 небеларускага сельскага савета 22 з`яўляліся польскімі, 14 — рускімі, 4 — яўрэйскімі, 4 — латышскімі, 3 — украінскімі, 2 — нямецкімі, 1 — літоўскім. Гэтыя польскія саветы ўключалі толькі 19% палякаў, якія афіцыйна былі зарэгістраваны, і 23,7% польскіх жыхароў вёскі.[3] З 1925 г. да 1933 г. колькасць польскіх сельскіх саветаў павялічылася з 2 да 40, аднак у наступным годзе яна паменшылася да 34.[4]

У пачатку 30-х гадоў у СССР былі створаны дзве мініяцюрныя польскія "сацыялістычныя рэспублікі!". Адна на Украіне, т. з. Мархлеўшчына (раён Жытоміра) і на Беларусі імя Ф.Дзяржынскага (недалёка ад Мінска). Цэнтрам польскага нацыянальнага раёна на Беларусі з`яўлялася" мястэчка Койданава. У койданаўскім прыгранічным раёне пражывала 50% палякаў. Калі далучыць да яго суседнія раёны, дзе жылі палякі (Уздзенскі, Заслаўскі, Мінскі), то гэтая лічба складала 60%.[5]

[1] Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы). Мінск, 3-5 лютага 1993 г. Тэзісы дакладаў і паведамленняў. Частка 1. Гісторыя Беларусі. М., 1993. С. 130.

[2] Там жа, с. 176.

[3] Mikolaj Iwanow. Pierszy narod ukarany polacy w zwiazku radzieckim 1921-1939/ Warzawa-Wroclaw? 1991. Panstwowe wydawnictwo naukowe. C. 141.

[4] Там жа.

[5] Там жа, с. 129.

Але койданаўскі польскі савет быў створаны не ў 20-я гады, а значна пазней. Спачатку былі непаразуменні ў кіраўніцтве рэспублікі, затым супраць стварэння такога раёна выступала кіраўніцтва Заходняй ваеннай акругі. Апошняя кропка ў стварэнні нацраёна была пастаўлена ў Маскве ў пачатку 1932 г. ЦК УКП(б) прыняў пастанову аб стварэнні нацраёна Койданава без узгаднення з ваеннай акругай. 15 сакавіка 1932 года ЦК камуністычнай партыі Беларусі зацвердзіў Койданаўскі польскі раён, у склад якога ўвайшлі 17 сельскіх саветаў. З іх польскімі з`яўляліся 9, беларускімі — 6 і 1 — яўрэйска-польскім. Польскімі саветамі лічыліся Маланеўскі, Негарэльскі, Ляхавіцкі, Рубінкаўскі, Навасадскі, Путчынскі, Нарэйкаўскі, Сталінскі, Фанінальска-Вязынскі.[1]

Газета "Орка" пісала ў тыя гады, што стварэнне польскага раёна на Беларусі яшчэ раз пацвердзіла рабочым масам СССР і працоўным фашысцкай Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, што толькі СССР з`яўляецца радзімай усіх народаў. Летам 1932 г. у Койданава прыязджала дэлегацыя рабочых палякаў з ЗША. У чэрвені 1932 г. раён атрымаў імя Ф. Дзяржынскага.

Кіраўніцтва раёнам было абрана і назначана з мясцовых палякаў, а таксама з камуністаў, якія прыехалі з Польшчы. Дарэчы ў складзе адказных работнікаў паветаў і губерняў Беларусі на 1.1.1925 г. з колькасці 911 чалавек беларусаў было 239, яўрэяў — 296, рускіх — 198, палякаў — 44, латышоў — 40, літоўцаў — 14, іншых — 17, без вызначэння нацыянальнасці — 63. У складзе КП(б)Б была значная колькасць палякаў.[2] У сакавіку 1934 г. сярод 34 старшынь польскіх сельскіх саветаў 27 з`яўляліся членамі партыі, 4 — камсамола і толькі 3-беспартыйнымі.[3] Першы сакратар Койданаўскага райкама партыі з`яўляўся членам ЦК КП(б)Б.

На развіццё польскага нацыянальнага раёна выдзяляліся значныя па тых часах сродкі. Толькі ў 1932-33 гг. дзяржыншчына атрымала 1,5 млн. рублёў, што ў два разы больш чым суседнія раёны.[4] У Дзяржынску былі пабудаваны адміністрацыйныя будынкі, школы і г.д. 31 мая 1932 г. быў адкрыты польскі сельскагаспадарчы тэхнікум. У маёнтку Станькава пачаў функцыяніраваць інстытут пад назвай Польскі Навуковы Камбінат. Гэта была педагагічная школа, якая рыхтавала настаўнікаў малодшых класаў. У 1933 г. у школе навучалася 110 студэнтаў. У наступным годзе ў Дзяржынску быў адкрыты Польскі калгасна-саўгасны тэатр.[5]

Усяго ў СССР было створана 670 польскіх пачатковых і сярэдніх

---

[1] Там жа. с. 130.

[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4, оп. 20, сп. 12, л. 22. 41.

[3] Mikolaj Iwanow. С. 368.

[4] Там жа. с. 138.

[5] Там жа, с. 134.



школ, 7 тэхнікумаў, дзве вышэйшыя навучальныя ўстановы (Кіеўскі польскі інстытут сацыяльнага выхавання і Мінскі польскі педагагічны інстытут), а таксама некалькі аддзяленняў у вну Масквы, Ленінграда, Кіева і Гомеля. Наладжана было савецкае судаводства на польскай мове.

Да 1933 г. у савецкай дзяржаве выдавалася на польскай мове 16 раённых, 6 рэспубліканскіх і 1 цэнтральная агульнасаюзная газета. Штогод выдаваліся сотні польскамоўных кніг, вяліся польскія радыёперадачы.

Былі створаны і актыўна дзейнічалі польскія навукова-даследчыя цэнтры ў сістэмах акадэмій навук Украіны і Беларусі.

У 20-я гады пры ЦК КП(б)Б існавала Польбюро. Работай польскамоўных навучальных устаноў рэспублікі кіравала Польбюро Народнага камісарыята асветы БССР. У 20-30 гг. на Беларусі на польскай мове выходзілі газеты "Mlot" (Молат), "Orka" (Ворыва), "Gwiazda Mlodzizy" (Зорка моладзі), "Szturmowiec Kojdanowszczyzny" (Ударнік Койданаўшчыны), пазней "Szturmowiec Dzierzynszczyzny" (Ударнік Дзяржыншчыны). Існавала Польскае аддзяленне Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў.

Паводле перапісу 1926 г. у БССР налічвалася 97,5 тыс. чалавек. У 20-30 гг. у Заходнюю Беларусь перасялілася каля 300 тыс. чалавек.[1]

Першапачаткова савецка-польскі эксперымент асабліва не выдзяляўся на фоне пашырэння правоў усіх без выключэння нацыянальных меншасцей у рамках так званага "нацыянал-нэпа". У канцы 20-х гадоў яго значэнне рэзка ўзрасло ў сувязі з нарастаннем у СССР варожых антаганістычных настрояў у адносінах да польскай дзяржавы.

Першая фаза рэпрэсій супраць польскага насельніцтва была звязана з нараджэннем калектывізацыі. У першую чаргу рэпрэсіі былі накіраваны супраць кіраўніцтва ЦК, польскай аўтаноміі, рэдакцый польскіх газет, школ, навучальных устаноў і навуковых работнікаў. Пасля падпісання польска-нямецкага дагавора пагоршыліся адносіны паміж СССР і Польшчай і ў 1935 г. перараслі ў варожасць. У СССР пачалася супрацьпольская кампанія і гэта адбілася на паляках, якія пражывалі ў савецкай дзяржаве. Лічылася, што паляк — гэта па большасці вораг народнай улады, шкоднік, фашысцкі шпіён. Усе палякі, якія пражывалі на тэрыторыі СССР, увайшлі ў катэгорыю "ненадзейных элементаў".

Скасаванне польскай аўтаноміі ў СССР пачалося летам 1935 г. Спачатку масавыя рэпрэсіі разгарнуліся на Украіне. Па ўказанню камісіі парткантролю пры ЦК КП(Б)У многія камуністы-палякі былі звольнены за "кулацкую палітыку", а потым арыштаваны. На 1.01.1937 г. на Украіне засталося толькі 27 польскіх саветаў — паменшылася ў 6 разоў. Усё польскае было забаронена. У пачатку 1938 г. была канчаткова ліквідавана польская аўтаномія на Украіне.

---

[1] Этнаграфія Беларусі. "БелСЭ". 1989. С. 381.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На Беларусі скасаванне польскай аўтаноміі праходзіла па тым жа сцэнарыі. Розніца толькі ў тым, што гэтая акцыя пачалася ў 1936-37 гг. Польскі раён фармальна існаваў да 1938 г., але ўжо ў 1937 г. раённая газета "Штурмавік Дзяржыншчыны" пачала выходзіць на беларускай мове. Дзяржынскі польскі раён быў падзелены паміж трыма суседнімі раёнамі. Цэнтральная польская рэспубліканская газета "Орка" выходзіла да мая 1937 г. У 1936 г. быў зачынены дзяржаўны польскі тэатр. Калі ў 1935 г. на Беларусі налічвалася яшчэ 135 польскіх школ, то ў 1937 г . іх не засталося ніводнай. у 1938 г . былі скасаваны ўсе сельскія саветы.[1]

Адной з форм скасавання польскай аўтаноміі на Беларусі было ўвядзенне сумесных польска-беларускіх школ, у якіх польскую мову вывучалі як прадмет, а выкладанне вялося на беларускай мове.

Памяншэнне колькасці польскіх школ прывяло да таго, што толькі 31% польскіх дзяцей у 1936 г. маглі наведваць польска-беларускія школы.

Масавыя высяленні людзей пачаліся з Украіны восенню 1937 г. На Беларусі масавы характар яны прынялі вясной 1938 г. Практычна ўсе палякі Дзяржыншчыны былі вывезены. Высяленню падвергліся палякі, якія жылі ў Слуцку, Полацку, Мінску. Асабліва рэпрэсіям падвергліся палякі, якія працавалі на чыгунках. Разам з імі былі рэпрэсіраваны літоўцы, фіны, латышы, эстонцы, немцы і інш. прадстаўнікі народаў, якія жылі на Беларусі.

Выключны характар рэпрэсій палякаў у савецкай дзяржаве выдзяляе польскую нацыянальную трагедыю 30-х гг. нават на фоне цяжкіх выпрабаванняў, якія выпалі на долю іншых нацыянальных груп.

Такім чынам, польская нацыянальная аўтаномія, у добрым сэнсе гэтых слоў, не адбылася. Яна стала своеасаблівым палігонам кампартыі Польшчы для правядзення эксперыментаў на апрацоўцы пробных мадэляў будучага будаўніцтва сацыялістычнай Польшчы.

## ФАРМІРАВАННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯЎ АРМІІ КРАЁВАЙ АКРУГІ "НАВАГРУДАК"

Дзейнасць Арміі Краёвай на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны мала даследавана да сённяшняга дня. Савецкая гісторыяграфія наогул замоўчвала сам факт існавання гэтай арганізацыі. Калі пра яе і ўспаміналася, дык толькі як пра буржуазна-нацыяналістычнае фарміраванне. Пры чым акцэнтаваўся класавы аспект гэтага вызначэння. Для ацэнкі дзейнасці Арміі Краёвай на Беларусі і, у прыватнасці, яе партызанскіх падраздзяленняў быў выкарыстаны прымітыўны ідэалагічна-палітычны прынцып: партызанскімі з`яўляюцца толькі тыя фарміраванні,

1 Mikolaj Iwanow, с. 368.



якія падпарадкоўваліся Цэнтральнаму штабу партызанскага руху. Астатнія, у тым ліку і АК, аўтаматычна прылічваліся да нелегальных, а значыць да злачынных і бандыцкіх арганізацый.

У апошні час цікавасць да гісторыі Арміі і Краёвай расце. Аднак шэраг газетных і часопісных артыкулаў амаль не ўнёс нічога новага ў даследаванне гэтай праблемы. У іх пераважае эмацыянальны падыход, няўзважаныя ацэнкі, нават прыдуманыя факты. АК абвяшчаецца барацьбітом супраць усяго беларускага, фактычна абвінавачваецца ў генацыдзе беларускага народа. Сёння робіцца акцэнт ужо не на буржуазны, а на нацыяналістычны (нават фашысцкі!) характар Арміі Краёвай.[1]

У сілу аб`ектыўна склаўшыхся абставін большасць прафесійных гісторыкаў не мае магчымасці азнаёміцца з літаратурай па праблеме, якая выйшла ў апошнія гады ў Польшчы. Дадзены артыкул і прызваны ў некаторай ступені запоўніць гэты прабел. У рабоце коратка асвятляецца гісторыя адной з акруг Арміі Краёвай, якая дзейнічала на тэрыторыі Беларусі. Для паўнаты карціны лакальная праблематыка разглядваецца ў сувязі з больш агульнымі пытаннямі, такімі як польска-савецкія адносіны ў 1939-1944 гг., задачы АК у плане "Бура".

Першыя спробы арганізацыі акругі адзначаюцца яшчэ ў 1939-1940гг.[2] Ужо ў лютым 1941г. у Гродна быў арыштаваны падпалкоўнік Януш Праўдзіц-Шляскі ("Борсук", "Праўдзіц"), у далейшым камендант Навагрудскай акругі да 12.06.1944г. Ён пабываў у турмах НКУС Мінска і Масквы, прайшоў разам з вязнямі мінскай турмы на пачатку Айчыннай вайны страшную "дарогу смерці" і цудам уцалеў. Пасля кароткага візіту ў Варшаву "Праўдзіц" восенню 1941 г. прыбыў у Шчучын. Начальнікам штаба акругі быў прызначаны капітан Станіслаў Сэндзяк /"Варта"/. Акруга АК "Навагрудак" мела граніцы даваеннага Навагрудскага ваяводства: тэрыторыя 37.195км 2, насельніцтва — 1,3 млн. чалавек. У 1942 г. месцазнаходжаннем штаба акругі быў выбраны горад Ліда.

Штаб акругі меў наступныя аддзелы: арганізацыі, контрразведкі, баявой падрыхтоўкі, кватэрмайстарскі, сувязі, БІП (бюро інфармацыі і прапаганды), сапёрны, легалізацыі, санітарны, пастарскі і канцылярыю. У складзе камандавання акругі працавалі спецыялісты-шыфравальшчыкі, кур`еры і камісар грамадзянскіх улад. Акруга дзялілася па прынцыпу: павет — канспіратыўная зона, 2-3 гміны — рота, і гміна — узвод, веска — аддзяленне. У склад акругі ўваходзілі наступныя зоны: Шчучын, Ліда, Іўе-Юрацішкі, Навагрудак, Стаўбцы, Слонім, Баранавічы і Нясвіж.[3] Умовы

1 *Васілеўскі П.* Абрэвіятура памятная. Літаратура і мастацтва, 1992, № 12; *Васілеўскі П.* На "крэсах" без перамен. Літаратура і мастацтва, 1992, № 227; *Сланеўскі А.* Армія Краёва: стрэл з мінулага. Звязда, 1993, 11 лютага.

2 *Prawdzic-szlaski J.* Nowogrodczyzna w walce 1940-1945. Szczecin. 1989, p. 22.

3 Ibid., p. 44-52.